**Список использованных источников**

1. *Ван, Фан.* Монохромный мир в картинах / Фан Ван // Китай. – 2013. – № 3. – С. 48–49.

2. *Е, Лан.* Обобщение истории китайской эстетики / Лан Е. – Шанхай : Жэньминь, 1885. – 663 с.

3. Ли, Ли. Вопрос современной китайской живописи / Ли Ли // Дианьнан газета. – 2000. – С. 8.

4. *Ли, Лэй.* Отличительные признаки современной художественной критики Китая / Лэй Ли // Культура. Наука. Творчество : VII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 29–30 мая 2013 г. / редкол.: В. П. Прокопцова [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2013. – С. 110–115.

5. *Фан, Миао.* Искусство Китая / Миао Фан. – Хэбэй : Жэньминь, 2004. – 163 с.

6. *Юй, Минь.* История эстетической мысли Китая / Минь Юй. – Шанхай : Фудань, 2010. – 411 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*К. Ф. Лысак, магістрант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – Т. Ф. Сухоцкая,*
*кандыдат культуралогіі, дацэнт*

# САЛІДАРНАСЦЬ ЯК СКЛАДНІК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Сучасны чалавек суадносіць сябе адразу з некалькімі сацыяльнымі групамі: працоўным калектывам, сям'ёй, навучальнай установай, субкультурай, нацыяй, якая сёння з'яўляецца галоўным суб'ектам гістарычнага і культурнага развіцця. Нацыянальная ідэнтычнасць – адзін з вызначальных фактараў дынамікі культуры ва ўмовах актывізацыі працэсаў глабалізацыі і інтэграцыі.

Нацыянальныя дзяржавы як ўдзельнікі сусветнай супольнасці імкнуцца паўнавартасна рэалізаваць сябе ў культурнай, палітычнай і эканамічнай сферах дзейнасці. Культурная і гістарычная адметнасць нацыі разглядаюцца як самакаштоўнасць. Гэта спрыяе абуджэнню пачуцця ўласнай годнасці, адказнасці за сваю будучыню, імкненню да паўнавартаснага самастойнага існавання. Актуалізацыя гістарычных каранёў супольнасці часта афармляецца ў міфалагему пра некалі страчаную веліч, «залаты век». У такім выпадку ўсе высілкі нацыянальнага руху накіраваны на вяртанне былой магутнасці і росквіту. Адраджэнскія рухі – гэта

з'ява не толькі «занядбаных» этнасаў, але і сучасных метраполій. З мэтай кансалідацыі насельніцтва, развіцця пачуцця адказнасці за будучыню сваёй Радзімы мэтанакіравана фарміруецца гістарычная памяць, ствараецца поле агульных каштоўнасцей, падкрэсліваецца аўтэнтычнасць нацыянальнай культуры, якая разглядаецца як адметнасць народа, падстава для яго яднання. Важнае месца займае стварэнне вобраза будучыні нацыі, яе непаўторнага прызначэння і ролі, якую яна адыгрывае ў свеце. Усе гэта павінна не толькі абуджаць пачуццё гонару і павагі да сваёй нацыі, яе гістарычнага лёсу, пачуццё сувязі са сваімі продкамі, але і адказнасць за будучыню наступных пакаленняў.

Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя існавала думка, што свет нацыянальных дзяржаў падыходзіць да свайго лагічнага канца. Але і сёння, негледзячы на інтэнсіўныя працэсы глабалізацыі, на стварэнне наднацыянальных эканамічных і палітычных утварэнняў, нацыя працягвае існаваць як калектыўны суб'ект культуры. Нават на несвядомым узроўні (пасіўна) чалавек успрымае навакольную рэчаіснасць з пазіцый сваіх нацыянальных асаблівасцяў.

Тым не менш, адкрытая інфармацыйная прастора, масавая культура істотна ўплываюць на свядомасць сучаснага чалавека і яго стаўленне да сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Зніжэнне ролі нацыянальнай ідэнтычнасці адкрывае шлях іншым уплывам, што не спрыяе прыняццю адказнасці за сваё жыццё, зніжае асэнсаванне неабходнасці дзяржаўнасці, пазбаўляе адчування прыналежнасці да вялікай і магутнай супольнасці. Гэта выклікае пачуццё адзіноцтва і страты сістэмы каштоўнасных каардынат, таму вывучэнне пытання нацыянальнай ідэнтычнасці з'яўляецца актуальным ў сучаснай культуралогіі.

Яшчэ ў XVIII ст. пытанне нацыянальнай ідэі пачалі даследаваць Жан Жак Русо, Ёган Гердэр, трохі пазней – нямецкі філосаф Ёган Фіхтэ. Але сапраўднае тэарэтычнае асэнсаванне феномена нацыяналізму пачалося толькі ў XX ст. Вялікі ўклад у свае часы зрабілі такія даследчыкі, як Эрнэст Гелнэр, Энтані Сміт, Бенедыкт Андэрсан. З айчынных аўтараў трэба вылучыць доктара сацыялагічных навук, прафесара Ларысу Рыгораўну Цітарэнка.

Як адзначае англійскі даследчык Энтані Сміт ў сваёй працы «Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі», усе нацыянальныя рухі ва ўсе часы патрабуюць трох рэчаў: аўтаноміі, адзінства і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

саматоеснасці [4, с. 162]. Такім чынам, да складнікаў нацыянальнай ідэнтычнасці можна аднесці наступныя: дзяржаўную прыналежнасць, адчуванне «ўваходжання» у супольнасць і адказнасць за яе лёс, культурную самаідэнтыфікацыю (мова, рэлігія, гістарычная памяць, традыцыі і г. д.). Як бачна, другі складнік немагчымы без асаблівага пачуцця братэрства, адкрытасці, сувязі і агульнасці з іншымі прадстаўнікамі супольнасці, раздзялення інтарэсаў, прызнання гонару і годнасці адзін аднаго, гатоўнасці разам бараніць лёс сваёй супольнасці і адказваць за яе будучыню. Менавіта салідарнасць спрыяе пераадоленню атамізацыі грамадства, стварае магчымасць для адкрытага і смелага абмену думкамі, ідэямі і пачуццямі, актывізуе грамадскую дзейнасць, стварае агульную сістэму каштоўнасцяў, спрыяе выпрацоўцы адзінага накірунку развіцця грамадства. Вывучэнне з'явы салідарнасці і звязаных з ёй праблем, асабліва ў межах нацыянальнай супольнасці, можа спрыяць пераадоленню негатыўных з'яў у сучасных грамадствах: страта іерархічнай сістэмы духоўных каштоўнасцяў, пачуццё «адзіноцтва ў натоўпе», пасіўнасць у пытаннях лёсу ўласнай нацыі, адсутнасць актыўнай грамадзянскай пазіцыі. З сінонімаў салідарнасці можна вылучыць такія з'явы, як «згода», «агульнасць», «аднадушнасць», «адзінагалоссе», «адзінства», «аднадумства».

Беларускі філосаф Мікола Крукоўскі, разглядаючы пытанне суб'ектыўнага і аб'ектыўнага ідэалу, вылучыў яго рэалізацыю на розных іерархічных ўзроўнях: на ўзроўні сям'і, вытворчага калектыву, прафесійнай агульнасці, класа, нацыі, сацыяльна-культурнага рыгіёну, чалавецтва і Бога. Пад імкненнем да рэалізацыі суб'ектыўнага ідэалу на розных узроўнях разумеецца дзейнасць у адпаведнасці з унутранымі маральнымі нормамі [2, с. 122]. Менавіта ўзровень нацыі, на думку філосафа, з'яўляецца як бы фокусам у рэалізацыі ідэалу, бо ён праецыруе неабходныя для суб'екта нормы на ўсе астатнія ўзроўні. Такім чынам, дасканаласць і пазітыўная фармулёўка нацыянальнай ідэі працягвае адыгрываць важную ролю ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыіі і без пачуцця салідарнасці як на ўзроўні нацыі, так і на любым іншым немагчыма паўнавартаснае распаўсюджванне і артыкуляцыя агульных нормаў і каштоўнасцяў.

У розныя часы салідарнасць з'яўлялася істотным складнікам нацыянальнага жыцця. У XI–XII стст. важныя палітычныя і эканамічныя пытанні вырашаліся толькі на агульным гарадскім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сходзе – веча. У помніку беларускай літаратуры XVI ст. «Песня пра зубра» Мікола Гусоўскі заклікае да адзінства розныя па веры і культуры народы перад агульнай пагрозай. Аднадумства вымагала дзейнасці заканадаўчага органу ў Рэчы Паспалітай – сойму. Нязгода нават аднаго ўдзельніка адмяняла прыняцце рашэння. У часы паўстання 1863 г. шляхціц Кастусь Каліноўскі звяртаўся да простага мужыка на яго ж мове, заклікаючы да сумеснай барацьбы супраць царскага прыгнёту, сыцыяльнай і эканамічнай няроўнасці, таксама выступаючы за нацыянальную самастойнасць. У першым нумары «Нашай нівы» адзначалася, што «газета не рэдакцыі, але ўсіх беларусаў і ўсіх тых, хто ім спагадае». Вакол яе гуртаваліся аўтары рознага паходжання, веравызнання, розных кірункаў, але ўсе яны выступалі за нацыянальнае адраджэнне Беларусі.

У сучасным грамадстве салідарнасць як складнік нацыянальнай ідэнтычнасці адыгрывае значную ролю і мае важныя функцыі, бо сучасны свет застаецца і будзе заставацца светам нацыянальных дзяржаваў. Салідарнасць стасуе паасобныя дзеянні і спрыяе руху да агульна прынятага вобразу будучыні нацыі, дае адчуванне прыналежнасці да моцнага калектыўнага суб'екту з багатай гісторыяй і традыцыямі, узмацняе пачуццё дзяржаўнай прыналежнасці – усё гэта шлях да індывідуальнасці, уласнага лёсу, уласнага мінулага, адраджэння і аднаўлення не толькі сваёй нацыі і дзяржавы, але і сябе.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Андерсон, Б.* Нации и национализм / Б. Андерсон [и др.]. – М. : Праксис, 2002. – 416 с.

2. *Крукоўскі, М. І.* Бляск і трагедыя ідэалу / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 2007. – 233 с.

3. *Радзік, Р.* Вытокі сучаснай беларускасці / Р. Радзік. – Мінск : Медысонт, 2012. – 371 с.

4. *Сміт, Э.* Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / Э. Сміт. – Мінск : Беларускі фонд Сораса, 1995. – 270 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ